**Праблема рэсацыялізацыі асуджаных: асноўныя аспекты, прынцыпы, стандарты**

**Эксперт па пытаннях пенітэнцыярнай сістэмы, юрыст Павел Сапелка аналізуе становішча спраў у месцах пазбаўлення волі Беларусі ў святле міжнародных стандартаў і сусветнай практыкі працы з асуджанымі.**

> ***Асноўныя прынцыпы абыходжання са зняволенымі*, Прынцып 10:***
>
> *З удзелам і пры садзейнічанні грамадскасці і сацыяльных інстытутаў і з належным улікам інтарэсаў пацярпелых ствараюцца спрыяльныя ўмовы для рэінтэграцыі былых зняволеных у грамадства ў найбольш спрыяльных для гэтага ўмовах.*
>
> ***Мінімальныя стандартныя правілы абыходжання са зняволенымі*, Правіла 80:***
>
> *Ад самага пачатку адбыцця тэрміну зняволення варта думаць пра будучыню, якая чакае зняволенага пасля яго вызвалення. Таму, яму варта дапамагаць падтрымліваць і ўмацоўваць сувязі з асобамі або ўстановамі, якія знаходзяцца за сценамі ўстановы, якія здольныя абараняць інтарэсы яго сям'і і спрыяць яго ўключэнню ў жыццё грамадства пасля вызвалення.*

За мінімальным выключэннем, усе зняволеныя пасля адбыцця пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі вяртаюцца ў тое грамадства, якое яны пакінулі на большы або меншы тэрмін. Ад таго, як зменяцца погляды і звычкі чалавека, які пераступіў закон, і, наадварот, колькі станоўчых якасцяў і сувязяў захаваецца ў яго, залежыць магчымасць рэінтэграцыі былога зняволенага. Аднак, учорашні зняволены, безумоўна, будзе мець менш магчымасцяў, і таму мае патрэбу ў адмысловым статусе, якім зможа скарыстацца пры неабходнасці і які засцеражэ яго ад небяспекі вяртання ў злачыннае асяроддзе.

Падрыхтоўка зняволенага да вызвалення і рэсацыялізацыя павінны пачынацца з першых дзён адбыцця пакарання і ўключаць у сябе, як мінімум, наступныя аспекты:

- зняволены павінен усвядоміць перавагу сумленнай працы як крыніцы атрымання сацыяльных выгодаў;

- зняволены павінен захаваць і прымножыць працоўныя і інтэлектуальныя здольнасці, якія ў яго былі;

- тыя з іх, хто не меў прафесіі, павінен атрымаць яе ў перыяд адбыцця пакарання;

- апошні перыяд адбыцця пакарання павінен быць прысвечаны актыўнаму працаўладкаванню і пошуку жылля пры неабходнасці;

- удзел дзяржаўных інстытутаў у вырашэнні сацыяльных і бытавых праблем павінна дапаўняцца паўсюдным заахвочваннем дзяржавай аказання дапамогі зняволеным з боку няўрадавых інстытутаў;

- праца з былым зняволеным павінна пераважна ажыццяўляцца непаліцэйскімі структурамі і быць заснаванай на заканадаўча замацаванай праграме рэінтэграцыі.

Безумоўна, не ўсе важныя аспекты згаданыя, але гэта дасць магчымасць больш падрабязна спыніцца на названых.

Усведамленне зняволеным перавагаў сумленнай працы можа быць рэальным ва ўмовах, калі праца выконвае функцыю, прадугледжаную мэтамі выпраўлення і адпавядае абавязковым крытэрам. У прыватнасці, пра гэта ўказана ў міжнародных дакументах:

**Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах*, Артыкул 8:**

3(a) Ніхто не павінен прымушацца да прымусовай або абавязковай працы;

(b) У тых краінах, дзе ў выглядзе пакарання за злачынства можа прызначацца пазбаўленне волі, спалучанае з катаржнымі працамі, пункт 3(a) не лічыцца перашкодай для выканання катаржных працаў паводле прыгавору кампетэнтнага суда, які прызначыў такое пакаранне;

(c) Тэрмінам "прымусовая ці абавязковая праца" ў гэтым пункце не ахопліваюцца:

(i) Якая б то ні была не згадваемая ў падпункце (b) праца або служба, якую, як правіла, павінна выконваць асоба, якая знаходзіцца ў зняволенні на падставе законнага распараджэння суда, ці асоба, умоўна вызваленая ад такога зняволення.

**Асноўныя прынцыпы абыходжання са зняволенымі*, Прынцып 8:**

Неабходна ствараць умовы, якія даюць зняволеным магчымасць займацца карыснай працай, якая ўзнагароджваецца, што палегчыць іх рэінтэграцыю на рынку працоўнай сілы іх краінаў і абавяжа іх аказваць фінансавую дапамогу сваім сем'ям і сваякам.

**Мінімальныя стандартныя правілы абыходжання з зняволенымі*, Правіла 71:**

(1) Праца зняволеных не павінна прыносіць ім пакуты.

(2) Усе асуджаныя зняволеныя абавязаныя працаваць у адпаведнасці з іх фізічнымі і псіхічнымі здольнасцямі, засведчаннымі лекарам.

(3) На зняволеных варта ўскладаць карысную працу, дастатковую для таго, каб запоўніць нармальны працоўны дзень.

(4) Праца, якая забяспечваецца зняволеным, павінна быць, па меры магчымасці, такой, каб павышаць або даваць ім кваліфікацыю, якая дазваляе ім заняцца сумленнай працай пасля вызвалення.

(5) Зняволеных, здольных атрымаць з гэтага карысць, асабліва малалетніх, варта навучаць карысным рамёствам.

(6) Зняволеныя павінны мець магчымасць выконваць працу паводле свайго выбару, калі гэта сумяшчальна з правільным выбарам рамяства і патрабаваннямі кіравання і дысцыпліны ва ўстанове.

**Мінімальныя стандартныя правілы абыходжання са зняволенымі, Правіла 72:**

(1) Арганізацыя і метады працы ва ўстановах павінны максімальна набліжацца да тых, якія прынятыя за іх сценамі, каб зняволеныя прывучаліся такім чынам да ўмоваў працы на волі.

(2) Аднак, інтарэсы зняволеных і іх прафесійную падрыхтоўку не варта падпарадкоўваць меркаванням атрымання прыбытку ад турэмнай вытворчасці.

**Мінімальныя стандартныя правілы абыходжання са зняволенымі, Правіла 73:**

(1) Кіраўніцтва прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасцю ва ўстановах лепш за ўсё ўскладаць на само турэмнае кіраванне, а не на прыватных падрадчыкаў.

(2) Зняволеныя, якія выконваюць працу, не кантраляваную установай, павінны знаходзіцца пад пастаянным наглядам супрацоўнікаў апошняй. За выключэннем выпадкаў, калі зняволеныя выконваюць працу для іншых урадавых устаноў, працадаўцы павінны выплочваць установе поўныя стаўкі заробку, які належыць за адпаведную працу, улічваючы пры гэтым прадукцыйнасць працы зняволеных.

**Мінімальныя стандартныя правілы абыходжання са зняволенымі, Правіла 74:**

(1) Правілы, якія тычацца бяспекі і аховы здароўя свабодных рабочых, павінны прымяняцца ва ўстановах.

(2) У выпадку траўмы на вытворчасці або прафесійных захворванняў зняволеным варта выплочваць кампенсацыю. Умовы гэтай кампенсацыі павінны быць не менш спрыяльнымі за ўмовы кампенсацыі, прадугледжаныя законам для свабодных працоўных.

**Мінімальныя стандартныя правілы абыходжання са зняволенымі, Правіла 75:**

(1) Максімальная працягласць працоўнага дня або тыдня ўстанаўліваецца законам або на аснове адміністрацыйных пастаноў, з улікам мясцовых правілаў і звычаяў у галіне ўмоваў працы для свабодных рабочых.

(2) Працоўны час варта размяркоўваць такім чынам, каб зняволеныя мелі па крайняй меры адзін дзень адпачынку на тыдзень і мелі час, дастатковы для вучобы і іншых відаў дзейнасці, неабходных для іх перавыхавання.

**Мінімальныя стандартныя правілы абыходжання са зняволенымі, Правіла 76:**

(1) За сваю працу зняволеныя павінны атрымліваць справядлівае ўзнагароджанне ў рамках пэўнай сістэмы.

(2) У адпаведнасці з гэтай сістэмай зняволеныя павінны мець магчымасць расходаваць па меншай меры частку зарobленых імі грошай на набыццё дазволеных прадметаў асабістага ўжытку і пасылаць частку сваіх заробкаў сям'і.

(3) Гэтая сістэма павінна таксама прадугледжваць, што частка зарobленых зняволенымі грошай застаецца на захоўванні адміністрацыі, якая перадае ім гэтыя зберажэнні падчас вызвалення.

Такім чынам, прадугледжана поўная забарона на прымусовыя або катаржныя працы. Аднак пералічаныя міжнародныя дакументы цалкам ясна сведчаць аб тым, што праца, якую выконваюць зняволеныя, аўтаматычна не падпадае пад гэтыя катэгорыі. Як мяркуюць навукоўцы-крымінолагі, «Асуджаных зняволеных можна абавязаць выконваць працу пры выкананні пэўных гарантый. Да іх ліку адносяцца:

наяўнасць мэты ў выконваемай працы;

праца павінна дапамагчы ім атрымаць кваліфікацыю, якая апынецца карыснай пасля вызвалення;

зняволеныя павінны атрымліваць аплату за выкананую працу;

умовы працы павінны, у асноўным, адпавядаць тым, якія выконваюцца ў грамадзянскай супольнасці, у асаблівасці гэта тычыцца патрабаванняў аховы здароўя і тэхнікі бяспекі;

працягласць працы не павінна быць празмернай і павінна пакідаць час для іншых заняткаў»**.

Многія зняволеныя, асабліва з ліку маладых, толькі ў месцах пазбаўлення волі далучаюцца да працы. Менавіта таму вельмі важна, каб праца не страціла для іх сваёй прывабнасці. З іншага боку, вялікая колькасць асуджаных трапляе ў заключэнне, маючы добрую кваліфікацыю, і плануе пасля выхаду на свабоду вярнуцца да ранейшага характара дзейнасці.

«Праца ў турме можа пераследваць дзве асноўныя мэты. Першая з'яўляецца досыць просты і заключаецца ва ўцягванні зняволеных у пастаянны распарадак дня - пад'ём, перамяшчэнне да месца выканання працы, штодзённая арганізаваная праца на працягу некалькіх гадзін разам з іншымі людзьмі. Аднак гэтага недастаткова. Мала сэнсу прымушаць зняволеных штодня ісці ў майстэрні, дзе яны выконваюць манатонную працу, вынікі якой, хутчэй за ўсё, нікому не патрэбныя. Горшым прыкладам гэтага з'яўляецца сістэма 19 стагоддзя, пры якой зняволеных прымушалі штодня, на працягу многіх гадзін і без усякай мэты круціць велізарныя цыліндры з пяском. Існуе мноства сучасных эквівалентаў гэтай бессэнсоўнай працы. Іншай мэтай з'яўляецца развіццё ў зняволеных пачуцця ўпэўненасці і навыкаў пры выкананні працы, якая мае пэўную мэту, калі яны адчуваюць, што атрымліваюць веды ў той галіне, якая хутчэй за ўсё дапаможа ім знайсці працу пасля заканчэння тэрміну зняволення. Гэта азначае, што праца ў турме павінна быць звязаная з навучаннем, накіраваным на набыццё зняволенымі тых ведаў і навыкаў, якія дазволяць ім атрымаць дастатковую кваліфікацыю

для працы ў традыцыйных галінах, такіх як будаўніцтва, тэхніка, кіраванне або сельская гаспадарка. Магчыма таксама навучанне і новым спецыяльнасцям, такім як праца на кампутары. Прафесійнае навучанне асабліва важна для больш маладых зняволеных. Пры распрацоўцы такіх праграм асабліва важна мець інфармацыю аб магчымасцях атрымання працы ў мясцовых супольнасцях, у якія вернуцца зняволеныя»**. Адзначаецца таксама важнасць прадастаўлення жанчынам доступу да ўсяго дыяпазону магчымых працаў у турме. Іх не варта абмяжоўваць толькі такімі працамі, як шыццё і рукадзелле.

Для таго, каб праца захавала прывабнасць для зняволеных, яна павінна быць справядліва аплочаная. У сусветным вопыце ёсць дзве сістэмы аплаты працы зняволеных: першая прадугледжвае выплату намінальнага ўзнагароджання, але не накладае на вязня абавязкі аплочваць выдаткі на сваё ўтрыманне ў турме. Другая, прызнаная больш прагрэсіўнай, прадугледжвае выплату зняволеным стандартнага ўзнагароджання за працу нароўні з «вольнымі» работнікамі і накладае абавязак удзельнічаць у аплаце ўтрымання зняволеных, кампенсаваць шкоду пацярпелым.

Ёсць поўная ўпэўненасць у тым, што ў месцах пазбаўлення волі Беларусі другая мадэль аплаты рэалізаваная з істотнымі недахопамі; спосабам, зводзячым на нішто яе перавагі.

Характэрны довад на карысць гэтага - зварот былога зняволенага Алеся Бяляцкага ў Дэпартамент выканання пакарання, у якім праваабаронца звярнуў увагу на наступнае:

«Я працаваў на працягу пазначанага часу поўны працоўны дзень поўны працоўны тыдзень на швейнай вытворчасці, выконваючы ў поўным аб'ёме даручаныя заданні.

У адпаведнасці з атрыманымі мной у УП «ПК №2 г. Бабруйска» даведкамі пра заробак, мне налічваўся заробак у суме

636 492 рублёў за 5 месяцаў (перыяд з 01.04.2012 года па 31.08.2012 года);

622 298 рублёў за 5 месяцаў (перыяд з 01.09.2012 года па 31.01.2013 года);

586 647 рублёў за 8 месяцаў (перыяд з 01.02.2013 года па 30.09.2013 года).

У адпаведны перыяд часу памер мінімальнага заробку ў Рэспубліцы Беларусь быў устаноўлены на ўзроўні:

Красавік - жнівень 2012 года - ад 1 000 000 да 1 104 640 рублёў у месяц;

Верасень 2012 - студзень 2013 г. - ад 1 104 640 да 1 395 000 рублёў у месяц;

Люты 2013 - верасень 2013 г. - ад 1 395 000 да 1 464 790 рублёў у месяц.

У адпаведнасці з артыкулам 8 Крымінальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, дзяржава гарантуе абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў асуджаных, забяспечвае ўстаноўленыя законам умовы прымянення пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці ў дачыненні да асуджаных, гарантыі сацыяльнай справядлівасці, іх сацыяльную, прававую і іншую абароненасць. Пры выкананні пакарання і іншых мераў крымінальнай адказнасці асуджаным гарантуюцца правы і свабоды грамадзян Рэспублікі Беларусь з абмежаваннямі, установленымі крымінальным, крымінальна-выканаўчым і іншым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

У адпаведнасці з артыкулам 100 КВК, асуджаныя да пазбаўлення волі маюць права на аплату працы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Памер аплаты працы асуджаных, якія адпрацавалі месячную норму працоўнага часу і якія выканалі ўстаноўленую для іх норму выпрацоўкі, не можа быць ніжэй за ўстаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь памер аплаты працы за выкананне адпаведных работ. Аплата працы асуджаных пры няпоўным працоўным дні або няпоўным працоўным тыдні вырабляецца прапарцыйна адпрацаванаму імі часу або ў залежнасці ад выпрацоўкі».

Падводзячы вынік, былы палітвязень запатрабаваў правесці праверку і ўстанавіць парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне аплаты працы адміністрацыяй УП «ПК №2 г. Бабруйска» у дачыненні да яго, а таксама запатрабаваў дадзеныя аб нормах выпрацоўкі на швейнай вытворчасці УП «ПК №2 г. Бабруйска» і працэнце іх выканання ім за перыяд з 01.04.2012 г. па 21.06.2014 г. і звесткі аб адпрацоўцы месячнай нормы працоўнага часу ў выглядзе выпіскі з табеля ўліку працоўнага часу за той жа перыяд.

Гэтыя звесткі, як правіла, у перыяд працы зняволеным не выдаюцца, паколькі выдача гэтых дакументаў не прадугледжана наўпрост дзеючым законам. Гэта няправільна, паколькі абмяжоўвае без належных падставаў працоўныя правы зняволеных. Улічваючы ўразлівае становішча зняволеных, ім варта без дадатковых напамінаў прадастаўляць поўныя звесткі пра адпрацаваны час, працэнт выканання працоўнага задання (нормаў выпрацоўкі), працэнт браку, расцэнкі пры здзельнай форме аплаты, памеры пагадзіннай аплаты працы, каб зняволены не мог сумнявацца ў тым, што аплата ягонай працы праведзеная справядліва.

Дарэчы, раней у даследаванні адносна дыскрымінацыі правоў зняволеных у працоўнай сферы ўжо адзначалася, што ў адрозненне ад астатніх работнікаў, зняволеныя не маюць ніякіх ільготаў і кампенсацый пры сумяшчэнні працы і вучобы.

Пры гэтым менавіта вучоба ў месцах зняволення можа стаць магутным фактарам падрыхтоўкі асуджанага да жыцця пасля турмы. Аднак, у Беларусі арганізавана толькі сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі зняволеных, дзе вядзецца навучанне рабочым прафесіям, тады як атрыманне адукацыі больш высокай ступені ці якаснае вывучэнне замежных моваў ва ўмовах зняволення немагчымыя.

Парадак аказання дапамогі вызваленым у іх працоўным і бытавым уладкаванні замацаваны ў Крымінальна-выканаўчым кодэксе Рэспублікі Беларусь. Больш падрабязна гэтыя нормы замацаваныя ў Пастанове Міністэрства ўнутраных справаў Рэспублікі Беларусь ад 15.01.2014 № 15 «Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку аказання адміністрацыяй установы крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных справаў Рэспублікі Беларусь дапамогі асуджаным да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу або да пазбаўлення волі ў працоўным і бытавым уладкаванні».

У адпаведнасці з КВК, не пазней як за тры месяцы да заканчэння тэрміну пакарання асуджанага адміністрацыя ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы праз тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў і камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта прымае меры па яго працоўным і бытавым уладкаванні. У дачыненні да асобаў, абавязаных кампенсаваць выдаткі, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, у выпадку неабходнасці іх працаўладкавання адміністрацыя ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы не пазней як за тры месяцы да маючага адбыцца вызвалення інфармуе аб гэтым суд, тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў і камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта па месцы жыхарства ўказаных асобаў. Парадак аказання адміністрацыяй установы крымінальна-выканаўчай сістэмы дапамогі асуджаным, якія ўказаныя ў гэтай частцы, у працоўным і бытавым уладкаванні ўстанаўліваецца Міністэрствам унутраных справаў Рэспублікі Беларусь.

Службай сацыяльнай адаптацыі ўстаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы з асуджанымі ад дня фактычнага адбыцця імі пакарання праводзіцца выхаваўчая праца з мэтай падрыхтоўкі іх да вызвалення, растлумачваюцца іх правы і абавязкі пасля вызвалення.

Інваліды I і II групы, а таксама мужчыны ва ўзросце старэй за 60 гадоў і жанчыны ва ўзросце старэй за 55 гадоў пры неабходнасці з іх згоды накіроўваюцца камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ў дамы-інтэрнаты для састарэлых і інвалідаў. Непаўналетнія, якія не маюць бацькоў, у неабходных выпадках перадаюцца органам апекі і папячыцельства па месцы жыхарства няпоўнагадовых для прадастаўлення ім статусу дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, і для іх далейшага ўладкавання.

Вызваленыя ад адбыцця пакарання ў выглядзе арышту або пазбаўлення волі забяспечваюцца бясплатным праездам да месца жыхарства або працы, а таксама прадуктамі харчавання або грашыма на дарогу паводле ўстаноўленых нормаў.

Пры адсутнасці неабходных па сезоне адзення, абутку і сродкаў на іх набыццё вызваленыя ад пакарання забяспечваюцца адзеннем і абуткам бясплатна, а таксама ім можа быць выдадзена аднаразовая грашовая дапамога.

Вызваленыя ад пакарання ў выглядзе абмежавання волі, арышту і пазбаўлення волі маюць права на працоўнае і бытавое ўладкаванне і атрыманне іншых відаў сацыяльнай дапамогі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Да нядаўняга часу апошняе палажэнне было ў асноўным дэкларатыўным і напоўнілася ў пэўнай ступені зместам з прыняццем у 2006 годзе Закона Рэспублікі Беларусь "Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь" і Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29.11.2006 № 1595 "Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку ўстанаўлення броні для прыёму на працу грамадзянаў, якія асабліва маюць патрэбу ў сацыяльнай абароне і не могуць на роўных умовах канкурыраваць на рынку працы", якімі былыя зняволеныя аднесены да катэгорыі тых, хто асабліва мае патрэбу ў сацыяльнай абароне і не здольны на роўных умовах канкурыраваць на рынку працы, і ім забяспечаныя дадатковыя гарантыі ў галіне садзейнічання занятасці насельніцтва.

З гэтага часу для працаўладкавання грамадзян, якія асабліва маюць патрэбу ў сацыяльнай абароне і не могуць на роўных умовах канкурыраваць на рынку працы, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўстанаўліваюць наймальнікам незалежна ад формаў уласнасці браню для прыёму на працу такіх грамадзянаў на наяўныя свабодныя працоўныя месцы (вакансіі).

Новы імпульс працы з былымі зняволенымі павінна была, відавочна, надаць Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14.04.2014 № 347 "Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку арганізацыі і фінансавання мерапрыемстваў па працаўладкаванні грамадзянаў, вызваленых з папраўчых установаў, у тым ліку частковай кампенсацыі выдаткаў па аплаце працы такіх асобаў".

У адпаведнасці з Палажэннем, мерапрыемствы па працаўладкаванні грамадзянаў, вызваленых з папраўчых установаў, ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам у выглядзе:

устанаўлення наймальнікам броні для прыёму названай катэгорыі грамадзянаў на працу;

садзейнічання ў пошуку падыходзячай працы;

прадастаўлення паслугаў па прафесійнай арыентацыі;

накіравання на прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі;

садзейнічання ў арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, дзейнасці па аказанні паслугаў у сферы аграэкатурызму, рамеснай дзейнасці;

фінансавання наймальнікаў - арганізацый любых арганізацыйна-прававых формаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія прадстаўляюць працоўныя месцы для працаўладкавання названай катэгорыі грамадзянаў, шляхам частковай кампенсацыі выдаткаў па аплаце працы грамадзянаў, вызваленых з папраўчых установаў.

Кардынальна новым з'яўляецца апошняе палажэнне. За кошт сродкаў бюджэту фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца частковая кампенсацыя выдаткаў наймальнікаў па аплаце працы грамадзянаў, вызваленых з папраўчых установаў, прынятых на працу па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, якія:

адбывалі ў папраўчых установах пакаранне, прызначанае паводле прыгавору суда, не менш за тры гады запар;

зарэгістраваліся ў органе па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў якасці беспрацоўных на працягу шасці месяцаў з даты іх вызвалення;

не змаглі працаўладкавацца на прыдатную працу па незалежных ад іх прычынах на працягу трох месяцаў з даты іх рэгістрацыі ў якасці беспрацоўных або зарэгістраваліся ў якасці беспрацоўных пасля праходжання прафесійнай падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

Праўда, устойлівага матэрыяльнага становішча былому вязню дасягнуць, дзякуючы норме аб кампенсацыі выдаткаў наймальніка, не атрымаецца: за кошт сродкаў бюджэту фонду кампенсуюцца выдаткі наймальнікаў на выплату заробку, які не перавышае мінімальны заробак, якая дзейнічае ў перыяд, за які выраблена налічэнне заработнай платы, а таксама сума абавязковых страхавых унёскаў у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь, налічаных на мінімальны заробак.

Пры наяўнасці грамадзянаў, вызваленых з папраўчых установаў, якія адпавядаюць патрабаванням Палажэння, орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне праводзіць з наймальнікамі, якія заявілі ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку звесткі аб наяўнасці свабодных працоўных месцаў (вакансій), падыходзячых для працаўладкавання дадзеных грамадзянаў, перамовы аб магчымасці іх працаўладкавання на ўмовах гэтага Палажэння. Пры згодзе наймальніка орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне накіроўвае да яго грамадзянаў, прафесійныя якасці якіх адпавядаюць патрабаванням дадзенага наймальніка, для працаўладкавання.

За даволі кароткі перыяд дзеяння Палажэння цяжка зрабіць выснову аб тым, наколькі дастатковыя і дзейсныя меры для рэсацыялізацыі зняволеных ім прадугледжаныя. Статыстыка злачынстваў сведчыць аб зніжэнні рэцыдыўнай злачыннасці ў 2014 годзе ў параўнанні з папярэднім годам на 6,8%. Тым не менш, з 49 943 асобаў, якія ўчынілі злачынствы ў 2014 годзе, 19 714 мелі судзімасць, 30 056 не працавалі і не вучыліся. На канец 2013 года ў Беларусі было 10 052 асуджаных тры і больш разоў да пазбаўлення волі. Для разумення фактычнага маштабу рэцыдыву, варта мець на ўвазе, што ў статыстыцы не ўлічаны асобы, якія дапусцілі рэцыдыў, але якія маюць пагашаную або знятую судзімасць.

Гэтыя паказчыкі прымушаюць казаць аб захаванні праблемы эфектыўнай рэсацыялізацыі былых зняволеных і неабходнасці змяняць падыходы да гэтага працэсу з тым, каб у ідэале кожны зняволены выходзіў на волю з пэўнымі гарантыямі працаўладкавання на канкрэтным працоўным месцы і атрымання пры неабходнасці жылля.

Рэалізацыі гэтых ідэй павінна спрыяць прадастаўленне асуджаным права за 2-3 месяцы да заканчэння тэрміну працяглага зняволення выходзіць за межы калоніі для пошуку працы і жылля, адаптацыі да ўмоваў жыцця на волі, аднаўлення сямейных, сацыяльных сувязяў.

Бачыцца, што гэтыя нормы павінны быць уведзеныя ў Крымінальна-выканаўчы кодэкс з умовамі, аналагічнымі тым, што суправаджаюць прадастаўленне магчымасці зняволеным перамяшчацца без канвою да месца працы, выязджаць за межы калоніі ў выключных выпадках, пражываць за межамі калоніі жанчынам, якія выхоўваюць дзяцей.

________________________________________________

***Асноўныя прынцыпы абыходжання са зняволенымі.** Прынятыя рэзалюцыяй 45/111 Генеральнай Асамблеі ААН ад 14 снежня 1990 года

**Мінімальныя стандартныя правілы абыходжання са зняволенымі.** Прынятыя на першым Кангрэсе Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па папярэджанні злачыннасці і абыходжання з правапарушальнікамі, які адбыўся ў Жэневе ў 1955 годзе, і адобраны Эканамічным і Сацыяльным Саветам у яго рэзалюцыях 663 C (XXIV) ад 31 ліпеня 1957 года і 2076 (LXII) ад 13 мая 1977 года

**Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах.** Прыняты рэзалюцыяй 2200 A (XXI) Генеральнай Асамблеі ад 16 снежня 1966 года

**** Падыход да кіравання турмой з пазіцый правоў чалавека. Дапаможнік для турэмнага персаналу.** Эндру Койл. Выданне Міжнароднага цэнтра турэмных даследаванняў (МЦТД)